№ 77 Ausgabe B.

ГОМАН

Беларуская Віленская часопісь
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Цана з перасылкай і дастаукай да хаты: на 1 год—10 м. 80 фэн., на ½ году—5 м. 40 ф., на 3 месяцы—2 м. 70 ф., на 1 мес.—90 фэн.

Адрэс рэдакцыі: Вільня, Віленская 33.
Адрэс адміністрацыі і экспэдыцыі: М. Стэфанская 23.

Цана абвестак: на 4-ай старане за радок дробнымі літарамі—25 фэніг.; дробныя абвесткі—па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці—60 фэн. за лінейку дробн. друкам

№ 77 (273). Год III. Вільня, 1 кастрычніка 1918 г. Цана 10 фэн. (5 кап.)

ТЭЛЕГРАМЫ.

30 верасьня.

Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага: і гэнэрал-ан-шэфа ф. Бэн'а: У Фляндрыі вораг прадаўжаў свае штурмы. Урыў ворага ў нашыя пазыцыі 27 верасьня змусіла нас адцягнуць назад наш фронт за адрэзак Гандцем і ачысьціць дугу Вутсэт. Варожыя атакі тутака здбіты. Паміж Пашэндаль і Бецэляр вораг пасунуўся до Морслед і Дадыцэль. Тутака мы яго затрымалі. Мы б'ёмся ў даліне Ліс.

Вялікія бітвы між Камбрэ і Сан-Кантэн. Супроць Камбрэ вораг зьдзьвігнуў 16 дыв. На поўнач ад Камбрэ паўтораныя 8 раз сільныя варожыя штурмы адбіты ўдачнымі контратакамі. Вораг варваўся у прадмесьце Камбрэ. Мы стаём на заходным беразе гораду і адбілі заўзятыя атакі. Атакі ворага на поўнач ад Маркойн зламаліся пры дарозе Камбрэ Масніер. На поўдзень ад Маркойнь вораг адціснуў нас за канал. Вораг атакаваў нас на фронце ГоньльеБэлянліз. Між Гоньле і Белінкур мы адбілі паўтораныя атакі ворага без астатка. Часова страчаныя Вільле-Гіслен мы адабралі контратакай назад. Паміж Бэлікур і Бэлянліз вораг перайшоў цераз канал. Мы яго затрымалі на лініі Бэлікур-Жанкур-Леокур.

Увялікім удачным заканчэньні ўчарашніх баёў участвавалі войскі усіх нямецкіх плямён. Англіцы заплацілі за свае мяйсцовые удачы вельмі крывавымі стратамі.

Фронт нямецкага Насьледніка: і ф. Гальвіца: Пры канале Уаз-Янь мы узялі палонных. Французы прадаўжалі свае заўзятыя штурмы між Свіп і Энь, амэрыканцы паміж Аргонамі і Маас. Паміж Обрів і Сомпіу мы адбілі дзевяціразовыя штурмы ворага перад нашымі лініямі. Далей на усход Манр і Ардэй засталіся ў руках ворага. З асобнай сілай амэрыканцы штурмавалі між Аргонамі і Маас. Іх штурмы зусім адбіты. З абодвух бакоў даліны Эр мы адабралі ад ворага Апрмон і лес Монтрбо і адкінулі амэрыканцаў больш як адзін кілёмэтр назад. Мы зьбілі учора 45 варожых самалётаў.

ВЕНА 28.IX. Ідучыя з Італіі весткі, што Аўстрыя мае зрабіць у хуткім часе з Італіяй асобны мір, ўсё яшчэ пашыраюцца агентамі. Мы упоўнамочаны давясьці да ведама, што гэтыя весткі зусім не адказуюць праўдзе.

ЛОНДОН. 28.IX. (Рэўтэр). Бышы міністар прэзыдэнт Эсквіт заявіў ў адной прамове у Мэнчэстры, што аустрыяцкае мірнае прадлажэньне, незалежна ад яго прычын, трэба лічыць непрактычным: «Прыйшоў час, калі найлепшыя галовы паміж саюзьнікамі павінны заняцца практычнаю старaной пытаньня аб саюзе народаў».

ГЭЛЬСІНГФОРС (В.Т.Б.). 28.IX. Пры сённяшнім урачыстым адкрыцьці надзвычайнае сэсеіі фінскага сэйму рэгент Свінхвуд заявіў, што будзе ўнесены новы праект констытуцыі, які павінен быць разгледжаны перад выбарамі караля. Праект мае колькі пунктаў, якія зьўляюцца уступкай жаданьням рэспубліканцаў.

КІЕУ. 26.IX. Вялікі князь Нікалай Нікалаевіч заявіў корэспандэнту газэты «Дня», што стварэньне новага усходняга фронту зруйнавала-бы Расею да канца. Ен ганіў, што саюзьнікі умешываюцца ва ўнутраныя справы Расеі і займаюць яе тэррыторыю. Ратунак Расеі можа прыйсьці толькі ад рускіх. Калі для гэтага патрэбна чужаземная помач, то трэба зьвярнуцца да Нямеччыны, інтарэсы якое бліжэй да рускіх. Украіна і Крым служаць прыкладам да таго, што немцы не мяшаюцца ва ўнутраныя справы занятых імі зямель.

ПАРЫЖ. 28.IX. Агенства Гаваса пацьвярджае патапленьне торпэдаю ў Адрыатыцкім моры францускай падводнай лодкі. Справа ідзець, відаць, аб патапленьні падводнай лодкі «Цырцэ», якая не вярнулася ў сваю гавань.

ВЕНА (В.Т.Б.). 29.IX. **Урадова.** На албанскім узьбярэжжы і пры Бэраце адкінута італьянскае наступленьне.

БЭРЛІН (В.Т.Б), 29.IX. У лічных удачных надпаветраных бітвах 28 верасьня нашыя марскія лётчыкі зьбілі 9 самалётаў і ўзялі 8 лётчыкаў у палон. У нас страт няма.

На фронце мае значэньне дзела. Дзелам бацькаўшчыны называецца: падпіска на ваенную пазыку.

Вільня, 1 кастрычніка 1918.

Беларускі народ, каторы прад вайной пачынаў толькі даведывацца, хто ён, пачынаў толькі варушыцца, з рэвалюцыяй прачнуўся і захацеў узяць свае справы ў свае рукі. Вышэйшым выяўленьнем волі беларускага народу ёсьць жаданьне незалежнасьці свае Бацькаўшчыны. Жаданьне гэта выходзіць не ад кучкі інтэлігентаў, не ад усяе навет інтэлігэнцыі, але ад усяго вялікага беларускага народу. Увесь беларускі народ на чысьленых зьездах выказаў сваё вялікае жаданьне стаць вольным і незалежным.

З таго мамэнту прайшло ўжо шмат часу. Але ня гледзячы на ўсе гонкі і перашкоды з боку нашых злосьнікаў і чужнікоў, ідэя беларускай незалежнасьці ідзе ўсё глыбей, усё шырэй і беларускі народ яшчэ галасьней крычыць: «Нахай жыве незалежная Беларусь!» Пагалелы, згарушчаны, спакутаваны беларускі ўцякач, раскінены па безмежным абшары былўшай Расеі, з поўнымі веры вачыма кажа: „а ўсё ткі мы даб'ёмся незалежнасьці!"

І нічога нам ня зробяць нашыя злосьнікі! Чаго нас гукаюць да Расеі? Маскоўцы нам свае? Аславянізаваныя монголы ня могуць быць аднае крыві з славянамі. Якія яны нам свае? Дый быць забітым аднолькава няпрыемна сваім ці чужым; разбойнік каторы дзяржыць нож ля горла сваёга брата ўжо яму ня брат. Што нам далі маскоўцы за 150 гадоў іх панаваньня над намі і што яны могуць даць? Апрача дэмаралізацыі, распусты, не разьбіраньне ў тым, што ёсьць добрае і што благое—нічога. Маскоўскі дух раскладае беларускую душу, ён аслабляе яе палёт. З здаровага духам, чыстага, пазіраючага ў неба беларуса, зробіўся-б паўзун па балоце, як масковец, катораму ўсё добрае і благое разам і каторы, здаецца, патрапіў-бы апаганіць самае неба сваім быцьцём. Ды цяпер яшчэ Маскоўшчына гарыць у агні анархіі і перастане гарэць ня скора і, прылучыўшыся да яе, ня толькі ня можна яе ўратаваць, але і самаму прыдзецца згарэць. Дык ня можа быць гутарак аб адбудове Расеі, аб прылучэньні да Маскоўшчыны.

На што нас заганяюць да Польшчы? Цяпер вядзецца нягодная агітацыя за Польшчу. Агітацыю вядуць ксяндзы і паны. Што дзеецца паміж каталіцкім духавенствам? Адна, пакуль што меншая, часьць яго, сьвядомая беларуская, перасьледуецца і выганяецца. Ксяндзом беларусам вышэйшыя польскія ўласьці зьвязаваюць рукі і ногі, і яны абязброенныя мусяць глядзець на бесканечныя мукі свайго народу. Вырабляюць-жа ксяндзы палякі тое чаго, здаецца, і сьніць ніколі ня можна было. Заганяючы беларусаў-каталікоў да Польшчы кс. палякі карыстаюць самым Богам у сваёй нягоднай рабоце. Ня хочаш беларусе-сялянпіе падпісацца пад просьбай аб прылучэньні да Польшчы, што шырацца ў павеце Беластоцкім і Сакольскім, і табе скажуць зьверы ў вопратцы ксяндза, што ты благі каталік, што не дастанеш збаўленьня. Уваходзіш цьвёрда за сваё, дабіваешся беларускай школы і інш., цябе часта ня прымаюць да споведзі. Дык запомні, беларусе сваіх непрыяцеляў і ведай заўсёды, што ад маскоўцаў і палякоў ты можаш аднаго спадзявацца—сьмерці! Сьмерці духоўнай, эканаміцкай і ўканцы, фізычнай. І стаі на сваім. На гэтэй зямлі мы жылі тысячы гадоў, мелі калісь нашыя продкі вольнае і шчасьлівае жыцьцё, як ня пушчалі гаспадарыць у сябе гэтым вашым злосьнікам. Зямлі роднай, змочанай нашым потам і крывёй мы не аддадзём, хоцьбы паны-палякі заклалі яшчэ болей банкаў, каб адабраць яе ад нас.

Мо скажуць, што ня зможам абараніцца ад Маскоўшчыны. Але няма ўжо тае Маскоўшчыны, што была раней. Ад тых жалезных рук, якімі Маскоўшчына дзяржала нас за горла 150 гадоў, ужо нічога не асталася. Цяпер Маскоўшчына толькі вялікшая за нас, але ж не адны мы, беларусы, дабіваемся незалежнасьці. Дабіваюцца яе і шмат іншых «інародцаў» і ўсе яны, апрача Польшчы, нашыя прыяцелі. Дык разам нас шмат. Хто спагадае палякам?— Апрача тых, далёкіх, што Польшчы мала знаюць—ніхто. Нашы-ж суседзі апрача палякоў і маскалёў, нашыя прыяцелі. Пры шчырай вялікай працы з нашага боку мы можам сьмела сказаць на ўвесь сьвет: няхай жыве вольная, шчасьлівая, багатая, няхай жыве незалежная Беларусь.

Пархвен Станіч.

Урэшце прызналіся.

Польскія нацыяналісты заўсёды стараюцца ўсіх пераканаць, што яны найлепшыя і найвярнейшыя сыны Каталіцкага Касьцёла: «Polonia semper fidelis» (Польшча заўсёды верная). Мэту гэтай работы лёгка зразумець. Усё гэта робіцца для таго, каб выкарыстаць сілу і ўплывы Каталіцкага Касьцёла на сваю карысьць. Вось заўзятыя нацыяналісты хочуць узяць монаполь навет на Каталіцкі Касьцёл.

Ведама, чалавеку не асьлепленаму нацыяналізмам, каторы спакойна і разважна глядзіць у мінуўшчыну, ясна, што гэта ёсьць толькі палітычная і нацыанальная рэклама. Але часамі і з польскіх вусн можна чуць слова праўды.

У № 218 «Dziennika Wilenskaha» невядомы аўтар, пішучы аб чэскім нацыянальным касьцёле, каторы пачынае знаходзіць прыхільнікаў між асобамі нічога супольнага з верай ня маючымі і для каторых істнуюць мэты толькі асабістыя, заканчываючы свой артыкул, кажа: «прыклад павучаючы» (przykład pouczający).

Дзеля гэтага мы разгледзім выпадкі ў гісторыі Польскага народу, з каторых мы ўбачым, як выглядалі між палякамі гэтыя „повучаючыя прыклады“ і як з боку палякоў былі спробы заразіць гэтымі прыкладамі беларусаў і літвіноў і толькі адпорны рэлігійны арганізм гэтых народаў ня даў разшырыцца пошасьці.

Першай пошасьцю, каторая раз шырылася ў Польшчы і каторая перайшла да нас была рэформацыя.

У векі рэформацыі прэдстаўнікі бязмална усіх гэрэзый ішлі ў Польшчу, пачынаючы ад прадстаўнікоў арыянства, лютэранства кальвінства, — ўсё гэта знаходзіла сэрдэчнае спатканьне ў Польшчы, усё гэта шырыла свае рэлігійныя перакананьні, усё гэта старалася зніштожыць Касьцёл каталіцкі і ня рэдка спатыкаем, што каталіцкае духавенства ў Польшчы або пераходзіла само ў гэрэзыі, або было ім прыхільна. А нашыя Літоўска-Беларускія вельможы заражаліся гэтымі навінкамі і усчапілі іх нам. I бачым у нас протэстанскіх казнадзеяў, перабегаючых з места да места, з двору да дому. I ўжо дайшла справа ў Польшчы да таго, што ў сэнаце усе крэслы, апрача займаных каталіцкімі біскупамі, былі ў руках протэстантаў.

Ці-ж гэта ня было спробай стварыць нацыянальны касьцёл?

Далей товянізм з яго містычна народнай асновай ці ня быў новай спробай стварэньня нацыянальнага касьцёла?

Возьмем стварэньне Польскага незалежнага Касьцёла ў Амэрыцы.

Праўда прычынай паўстаньня яго быў ўціск з боку біскупаў ірляндцаў, які цярпелі палякі ў каталіцкім касьцёле, але нам здаецца, што адлучэньне больш 100 тысячаў палякоў ад праўдзівага касьцёла, стварэньне свайго нацыянальнага з сваей герархіяй не даводзіць рэлігійнай прывязанасьці палякоў да Каліцкага Касьцёла. Але гэта было ў Амэрыцы, дзе народ польскі быў адарваны ад сваіх вёсак, папаўшы ў благія варункі, пазбыўся веры. А казлавіты? Гэта-ж адна гістарычная кабета і некольки шубраўцаў ксяндзоў, адцягнулі ад каліцтва больш за 15 ксяндзоў і да 80 тысячаў народу. 1 гэта было ня ў чужым баку, а ў сваім краю, сярод сваіх старых вёсак, пры сваіх касьцёлах, у каторых іх хрысьцілі і гдзе з боку духавенства яны ня мелі ніякага ўціску. Гэта-ж і нас хацелі гэтым самым казлавітызмам пачаставаць, гэта-ж і да нас сюды наежджалі з Польшчы розныя Фурманікі, Ковальскія, гэта ж і нас хацелі перавясьці на сваю „польскую“ веру.

Казлавітызм гэта яшчэ адзін довад прывязаннасьці палякоў да Каталіцтва. Возьмем Унію. Калі праваслаўныя біскупы захацелі ўпарадкаваць царкоўныя справы і палажыць мяжу раздзелу Царквей і з гэтай мэтай злучыўся з Заходным Касьцёлам, то палякі, калі ўбачылі што Унія будзе перашкодай ў апалячываньні, гэтулькі палажылі стараньня, каб Унію уніштожыць.

Гэта-ж бедныя уніяцкія біскупы крывавымі сьлязьмі залівaліся ад прыхільнасьці і каталіцкай помачы палякоў.

Гэта яшчэ адзін довад каталіцкасьці палякоў.

А польскія школы? Гэта ж рэнэгаты Уніі Семашко, Зубко і шмат інш.—гэта-ж былі адукаваныя на тэолёгічным факультэце Віленскага Унівэрсытэту, ў найлепшым часе яго разьвіцьця, калі былі такія профэсіры, як Сьвядэцкія і інш.—але Семашка і інш. слухалі выкладаў кс. Клонгевіча, што ў часі сваіх лекцый высьмеіваў з папежаў; слухалі выкладаў кс. Стройноўскага, што адняў духоўныя сэмінарыі з-пад загаду біскупаў, бо уважаў што ім няма чаго ў сэмінарыі рабіць.

Гэта-ж Жылінскія, Сэнчыкоўскія, Тупальскія, Немекшы і інш. ксяндзы, што хацелі зніштожыць у нашым краю каталіцтва, гэта былі вучні польскіх школаў і самі былі палякамі, ў сваім часе замешаныя ў паўстаньню.

А хто шырыў на Літве і Беларусі масонства? Палякі, а навет і польскае духавенства, бо ў Віленскай капітуле ўжо сядзелі прелаты-масоны.

А сумысльнае пашырываньне між сялянамі беларусамі і літвінамі фальшывага погляду, што яны „польскай веры“, а потым гэта выкарыставалася пры запісах як палякоў.

Усё запраўды веруючае польскае грамадзянства ў Польшчы і на Літве дасканальна ведае, што ўсе свецкіе людзі так голасна вымагаючыя ў касьцёлах польскай мовы, стаячыя на грунце быццам каталіцкім, самі ёсьць падшыўшыміся пад клерыкалізм — няверуюючымі.

Вера ў палякоў складаецца толькі з нацыяналізму, няма ў яе ані глыбокага пачуцьця, ані запраўды шчырых малітваў, бо ў іх усё замяняе патрыотычная песьня.

Даволі ўспомніць, што ў Варшаве ў часе ўрачыстасьці ўгодак 3 мая была імша і ў часе консэкрацыі музыка іграла... „мазура Домброўскага“.

Наапошку ня маем патрэбы шукаць прыкладаў у Варшаве, калі ў нас у Вільні сёлетняя працэсія на Божае Цела замянілася ў палітычную дэмонстрацыю і больш мы чулі песьню „Boża c ś polska“ чымся „Twoja cześć chwała“.

Але нялепшае свядоцтва дае палякoм вядомы духоўны пісьменнік нябошчык жытомірскі біскуп Кароль Недзялкоўскі (паляк). „З усіх славян католікаў—кажа біскуп, малай каталіцкай сьвядомасьцю палякі католікі далі толькі выперадзіць сябе чэхам!—Значыць палякоў выперадзілі ў свядомасьці і ў каталіцкай працы малыя народы, як славенцы, славакі і харваты—каталікі.

З гэтага ўсяго бачым, што „Polonia semper fidelis“—гэта толькі дабратлівы камплімент ня маючы вялікшай вартасьці.

Дык трэба сказаць рэдакцыі «Дзенніка Віленскага» шчыры дзякуй, што яны хоць цяпер зьвярнулі на гэта сваю увагу. Хацелася б толькі, каб «Dz. W.» пісаў троху ясьней.

І. Даубня.

Аб праваслаўнай царкве на Беларусі.

Як добра кажа ў №№ 74 і 76 «Гомана» вядомы прадстаўнік беларусаў-каталікоў аднэй з найпільнейшых спраў беларускага адраджэньня ёсьць увядзеньне беларускае мовы ў Касьцёл. Гэта самае мы, праваслаўныя беларусы, павінны сказаць аб праваслаўнай Царкве ў нас. Быў некалі час, калі прадстаўнікі праваслаўнай Царквы былі найлепшымі абаронцамі беларускай ідэі і беларускага народу. Пасьля памалу, як упадала беларуская культура, і праца праваслаўнага духавенства для беларуск. справы таксама слабела. Але ажно да 1839 году беларуская мова адна панавала ў праваслаўнай Царкве на Беларусі. Службу адпраўлялі паславянску, а пропаведзі і выясьненьне абрадаў былі пабеларуску. I нікому тады ня прыходзіла навет удум, каб можна было ў Царкве ў нас замяніць беларускую мову якой-небудзь іншай. Аднак тое, аб чым нікому ня думалася, што ішло проціў самае прыроды, зрабіў цар Мікалай I. Указам яго ў 1839 г. беларускую мову было забаронена ўжываць у цэрквах і касьцёлах. Але ня гледзячы на гэты забарон, беларуская мова і пасьля 1839 г. неафіцыяльна ўжывалася ў цэрквах. Трудна было адразу вырваць тое, што беларускі народ меў з самага пачатку свайго культурнага жыцьця. Але пасьля русыфікатарскія сэмінарыі зрабілі сваё. Новае пакаленьне сьвяшчэньнікаў, адарванае ад усяго роднага, абмаскаленае, стала па духу больш маскоўскім, чымся праваслаўным і беларускім. Справы праваслаўнай царквы былі закінэны, выступіла затое ярка дзела абрушэньня свайго народу. Самае наварочаваньне на праваслаўе было зроблена з русыфікацыйнай мэтай. Нацыянальнае здрадніцтва стала гонарам. За яго нашых сьвяшчэннікаў ждала павыжшэньне. Затое як перасьледаваны былі тыя сьвяшчэннікі, што аказаліся вернымі слугамі Царквы роднага народу.

Разам з беларускім адраджэньнем пачаўся рух і сярод беларускага праваслаўнага духавенства. Рух гэта дагэтуль вельмі пашырыўся.

Цяпер, калі незалежнасьць Беларусі стала справай дня, калі яна ня гледзячы на ўсе перашкоды нашых непрыяцеляў, робіцца што раз паўнейшай, справа беларускай праваслаўнай Царквы стаіць прад намі ўва ўсёй сваёй шырыні. Перш-на перш мы павінны дабіцца незалежнасьці сваe Царквы. Патрэбна, каб беларуская праваслаўная Царква не залежыла ад Маскоўшчыны, каб найвышэйшае ўпраўленьне Царквой, было ў нас, на Беларусі, як гэта ёсьць у Сэрбіі, Балгарыі, Грэцыі і іншых праваслаўных краёх. Далей павінны быць зьбеларушчаны ўсе духоўныя сэмінарыі.

Разам з гэтым проповедзі ў цэрквах павінны быць пабеларуску, ня кажучы ўжо аб навучаньні рэлігіі ў школах. Сьвяшчэньнікі, каторыя толькі разумеюць, але забыліся гаманіць пабеларуску, павінны навучацца беларускай мовы. Сьвятай павіннасьцю кожнага сьвяшчэньніка ёсьць праца для культурна-нацыянальнага, палітычнага і эканамічнага адраджэньня свайго народу. Гэтым яны найбольш памогуць і справе свае Царквы.

Максім Саколіч.

Беларускае мастацтва.

Цяпер у Менску краявая выстаўка, уладжаная штабам 10 арміі. Выстаўка прадстаўлена надзвычайна багата. Вось што ў „Новым Вѣстнику“ піша аб ёй між іншым Івашка Гастольд:

„Краёвая выстаўка, уладжаная штабам 10-е арміі звярочвае асаблівую ўвагу сваім багацьцем і паўнінай абразоў мінуўшага старавечнага мастацтва краю. Характар яе ярка беларускі, і гэта зразумела, бо чужыя ўплывы былі толькі пазьней.“ Аўтар пакуль што у № 155 разглядае толькі мастацтва, прадстаўленае на выстаўцы. Добра кажа у каталёзе ў прадмове

БЕЛАРУСКІЯ ПРЫПЕЎКІ.

I. Скочныя.

Мяцеліца.

Бадай таго каваля
Мяцеліца замяла,
Як ён мяне маладу
Замарозіў на ляду.

*

Курыць-веіць мяцеліца, —
«Чаму стары ня жэніцца?
Ух, ух, ух-у-ха!
Чаму стары ня жэніцца?»
— Да яшчэ-ж я ня стар,
— Яшчэ вус мой сіў ня стаў
Курыць-веіць мяцеліца, —
Твой хахол ужо бялеецца.

*

А рыбачка-плотачка,
Люблю цябе, котачка,
Што ты лёгка танцуеш,
Чаравічкаў ня псуеш.

*

Ты, дзеванька, роўна йдзі
У староны не глядзі.
Кідай, дзеўка, дурэці,
Насьля будзеш глядзеці.

*

Як я ехаў каля млына,
Ажно дзеўка, як маліна.
Я на яе паўзіраўся,
Ажна воз заламаўся.
Ня жаль-жа мне таго воза,
Абы дзяўчынёнька гожа,
Ажно рыжа ды пагана,
Што мне воз паламала.
„Хоць я рыжа ды пагана,
Ды мой бацька багат:
Чтыры волы у аборы,
I на шыі дукат“.
— А чорт цябе пабяры
З тваім бацькам багачом...
Чтыры волы паздыхалі,
I дукат спаганом.

*

Ішла баба дубнячком
Зачапіла гаплічком:
Баба ў голас, баба ў крык,
Адчапіся мой гаплік!

*

Юрка.

О ты Юрачка,
Што ня жэнішся,
Прыдзе зімачка,
Дзе падзенешся?

*

Гаспадар Юрка,
I сталяр Юрка,
I шавец Юркі
Да аднэй дачуркі.

Таўкачыкі.

Для скаканьня „таўкачыкоў“ на падлозе раскладаюцца на крыж дзьве лучынкі. Скакуха робіць па ў правым споднім куце, $\frac{2 | 4}{3 | 1}$ потым пераходзіць у левы верхні; адсюль яна адступае ў левы сподні і далей у правы верхні. Адсюль узноў назад—у правы сподні і г. д. Скачуць на наскох і не зачапляючы лучынак. Скок цяжкі, але вельмі харошы.

Гэй-гэй, таўкачыкі!
Гэй-гэй, дубовыя!
Гэй-гэй, дубовыя,
На работу гатовыя!
Сем год бадзяліся,
У одну ступу сабраліся!
Гэй-гэй, таўкачыкі,
Гэй гэй, дубовыя!

*

Гоп, гоп таўкачыкі,
Гоп, гоп асінавы,
А работы Максімавы;
Сем год валяліся
Цяпер ў ступу сабраліся,
Гоп, гоп, таўкачыкі!

*

Антон маладзенькі піў мёд саладзенькі,
Прыкаціўся к бочацца, п'ець і яшчэ хочацца.
Антон казу вядзэць, тпруц-тыц, кажа ня йдзець,
Антоніха надганяець, на Антона паглядаець!

Верабей.

Чы-чы, чы чы, верабей!
Ня клюй канапель!
Я гэтаму вераб'ю
Калом ножкі пераб'ю.
Верабейка скачаць,
Ды па ножцы плачаць.

д-р А. Іппель, што слова „Беларуская школа мастацтва“ ўжыта тут першы раз. Гэта й праўда, бо дагэтуль беларускім мастацтвам у нас ніхто не займаўся і навет ніхто не дадумываўся, што яно наагул можа быць. Д-р Іппэль кажа, што ёсьць старая памятка беларускага мастацтва, абраз у катэдральным касьцелі ў Кракаве, азначаны 1450 годам і надпісам кірыліцкімі літарамі па беларуску. Надпіс кажа, што мастак места Вільні па загаду Гаспадара Казіміра Ягайловіча намаляваў гэны абраз. Для нас гэта цікаўны факт быцьця і захову такое дарагое памяткі з пагляду гістарычнага мастацтва (беларускага), дый яшчэ ў сталіцы Польшчы ў Кракаве.

Але археолёгам нічога невядома аб старых у візантыйскім стылі фрэсках, знойдзеных у касьцёлах Польшчы, як у Кракаве, так і ў месьце Любліне. Тымчасам гэныя фрэскі маюць таксама надпісы па беларуску кірыліцкімі літарамі з азначэньнем варункаў свайго паказаньня ў сьвет а так сама году. Разьяснім іх паўстаньне з гістарычнай мінуўшчыны. Як ведама польскі кароль, раней літоўскі вялікі князь Ягайла сын літоўскага вялікага князя Ольгерда і яго жонкі (беларускі) цьверскай княжны, — зняўшы польскі пасад і асеўшы ў каралеўскім замку ў Кракаве, астаўся тым с мым беларуска-літоўскім князем, якім і раней быў. Яго двор складаўся з беларусаў, літвіноў і палякоў; гаманіў ён толькі пабеларуску, аб чым сьведчыць польскі гісторык Шайноха; апошняя яго жонка Софія была беларуская княжна. Ведама, што сын Ягайлы і Софіі, Казімір, вырасшы сярод беларусаў і жыўшы, як польскі кароль і літоўска беларускі вялікі князь то ў Кракаве, то ў Вільні, таксама быў балей беларусам, чымся палякам.

З гэтымі двома каралямі злучаныя фрэскавыя працы беларускіх артыстаў у Польшчы канца XIV, пачатку XV і другой палавіны XV века. Фрэскі або справядлівей астачы фрэскаў у Любліне на сьцяне мясцовага турэмнага касьцёла адносяцца да 1413 г., надпіс паказавае імя майстры—Андрэя. Фрэскі ў Кракаве ў катадральным касьцелі каралеўскага замка, дзе пахаваны кароль Казімір і яго жонка Альжбета, з дому аўстрыяцкая прынцэса, пакрываюць усе сцэны капліцы, так што яна робіць уражаньне праваслаўнай царквы. Надпіс паказавае, што работы былі скончэны ў кастрычніку 1478 г.

З гэтых гістарычных данных відаць, што беларуская школа мастацтва мае за сабой багатую мінуўшчыну. Самы стары абраз № 94 на выстаўцы адносіцца да 17 сталецьця. Ен мае надпіс пабеларуску каторы кажа, што Эўдакім Камінскі з Балочак (Ігуменскі павет) „фундаваў“ гэны абраз на памятку памёршае 16-ёх гадовае дачкі свае Тацяны. Другім вельмі важным абразам ёсьць № 95, на каторым намаляваны Радзіны Сьвятой Багародзіцы; гэты абраз дарагі тым, што ўсе жонкі на ім у беларускіх народных вопратках (на галовах «намёткі»); ён адносіцца да 1649 году, як сьведчыць аб гэтым надпіс пабеларуску артысты: Року Божага 1649 Пётр Эўсэевіч з Голыніч (5 вёрст ад Магілева). Цікаўны яшчэ дзеля свайго надпісу абраз № 101; на ім намаляваны Хрыстос-паўтакратар; надпіс паказавае, што абраз аднаўляў слуга Божы Козьма Гарай дзеле адпушчэньня грахоў 1723 году. Таксама зварочавае на сябе ўвагу каталіцкі абраз сь. Цыцыліі, апякункі музыкі, з рысункам беларускіх народных музыкальных інструмэнтаў: дуды, ліры і тэорбана.

Усе абразы і дзеля свайго зьместу і дзеля надпісаў і дзеля свае высокай артыстычнае работы прадстаўляюць высокую археолёгічную і артыстычную цэннасьць Характар іх стылю мяшаны, тут ёсьць заходня эўропейскі ўплыў, каторы зьмякчае сухі і мёртва-сьцюдзёны бізантыйскі стыль. Гэта й няма дзіва: усе балей дарагія і артыстычныя абразы з свайго паходжаньня з быўшых уніяцкіх цэркваў нашага краю“.

Выпадкі у Булгарыі.

БЭРЛІН. 26 IX. **Глаўная Камісія Рэйхстагу.** Штатс-сэкрэтар фон-Гінтце ўвядамляе гэта так: «Як Вам ведама з ваенных падзеяў апошніх дзён баўгары паміж Вардарам і Чэрнай знаходзяцца ў паважных клапотах. Ваенныя выпадкі ўплылі на суседнія баўгарскія арміі. Весткі з фронту былі зразумлены баўгарскім урадам Малінава занадта грозна. Учора раніца ў Софіі выдана заметка для друку, водлуг каторай Баўгарыя прадлагае адразу закончыць саюзным арміям варожыя дзействы і прыступіць да мірных перагавораў. Згодна з гэтай весткаю баўгарская дэлегацыя ў сераду вечарам быццам ужо адправілася ў Салёнікі.

З тых вестах, што цяпер ёсьць, нельга вывясьці ці пастуцае баўгарскі ўрад Малінава ў згодзі з баўгарскай арміяй, парлямэнтам і каралём. Нікаторыя партыі парлямэнту і ўплывовыя колы народу ня хочаць і чуць аб сэпаратным міру. Паплечнікі саюза з цэнтральнымі дзяржавамі, хіба што павядуць адпаведную работу. Пры першых вестках аб выпадках на Макэдонскім фронці нямецкая глаўная кватэра паслала валікія сілы на помач баўгарам. Аўстрыякі так сама паслалі значныя сілы для падтрыманьня. Спэцыялісты думаюць што пасланых сілаў зусім хопіць для ўстанаўленьня ваеннае роўнавагі. Палажэньне паважнае, але няма прычыны дапускаць, што Баўгарыя мае страціць назначаныя мэты».

БЭРЛІН. 27.IX. Рэўтэр памедамляе аб палажэньні ў Баўгарыі, што саюзьнікі адхілілі перагаворы аб замірэньні, аднолька згадзіліся пачаць перагаворы аб міры. А баўгарскай дэлегацыі ходзяць самыя розныродныя весткі. З тутэйшых вестак яна ўсё яшчэ знаходзіцца ў Софіі.

БЭРЛІН. «Voss Zeitung» дае такі абраз палітычнага палажэньня у Баўгарыі. Малінов — правадыр дэмакратычнай партыі, міністар-прэзыдэнт парлямэнцкай большасьці — ня будучы ў сілах стварыць коаліцыйная міністэрства, стварыў яго толькі з свае партыі, прылучыўшы колькі радыкалаў. З 217 членаў парлямэнту да яго партыі належыць толькі 40. Да паплечнікаў цэнтральных дзяржаў належаць знаходзячыяся у оппозыцыі стамбулаўцы.. Быўшы міністар-прэзыдэнт Радославаў вярнуўся у Софію і зрабіў сход аппозыцыйных членаў парлямэнту.

У Вільні і ваколіцах.

× **«Крывічанін»** Вышаў першы номер беларускага месячніка „Крывічанін“. Змест: „Памятнік“ М. Богдановіча. Ад Рэдакціі. Нацыянальнае пытаньне. В. Ластоўскага. Тураўскае Княства. В. Ластоўскага. Сонэт М. Багдановіча. Абшар і лік жыхароў Беларусі у межах этнографічных паводле статыстычных даных 1914 году (пачатак) І. В. Прыповесьць аб старым мужу і гожай дзеве (са стара беларускай літэратуры) В. Ластоўскага. Русалкі. Фантазія Змітрака Бядулі. Энэіда. Усяго па каліву. Кроніка, Шарады. Жарты.

Рэдактар-выдавец В. Ластоўскі. Вільня. Завальная 7.

× **Выхад з расейскага падданства** Срок для выступленьня з расейскага падданства прадоўжаны да 24 верасьня старога стылю (7 кастрычніка нов. стылю).

× **Узнаўленьне крэдытовых опэрацыяў.** Трэцяе Віленскае Таварыства Ўзаемнага Крэдыту дастала разрашэньне пачаць ізноў сваю работу прарваўшуюся 1915 року.

× **Таварыства для гандлю лесам.** Тутака стварылася камандытнае таварыства пад фірмай «Таварыства лесаўласьнікаў у Вільні». Мэта новага таварыства разумнае карыстаньне з лесу і гандальдрэвам.

× Штадтгауптман уведамляе, што ўсе ўласьнікі або упраўляючыя дамамі, каторыя не здалі дагэтуль медныя бляхі і пакрыўкі ад печаў павінны зрабіць гэта не пазьней за 2 кастрычніка. Неспаўненьне гэтага загаду цягне за сабою срогую кару.

× **Загад аб прадажы гарбаты.** Начальнік упраўленьня Літвы публікуе загад, водлуг каторага пачкі гарбаты павінны мець точнае азначэньне іх вагі. Пры фунтах заўсёды павінна быць азначана, ці яны рускія, ці нямецкія. Нарушэньне гэтага прыказу цягне за сабою штраф 2.000 марак, або 6 тыдняў турмы.

× **Рабунак на граніцы.** Тыя, што прыежджаюць з Расеі, жаляцца на істнуючы на пагранічнай станцыі Тарошыно абычай чырвона-гвардзістаў рабаваць пасажыраў Вярнуўшыяся гэтымі днямі кажуць, што іх партыю з 25 асоб чырвонагвардзісты затрымалі і разьдзеўшы да голага жанок бязстыдна іх разглядалі. З вопраткі выпарывалі падшэўкі, адрывалі падошвы і абсацы. Чырвоныя гвардзісты зрабавалі гэтую партыю на 150 тысяч, прычым толькі ў аднэй дамы адабралі брылянтаў на 40 тысяч.

× **Паляваньне на ваўкоў.** Каманда 10 арміі загадам ад 18 верасьня пазваляе кожнаму біць ваўкоў, але ўжыцьце пры гэтым агнястрэльнага аружжа дазволена толькі тым, хто мае на гэта пазваленьне. За забіцьце старога ваўка казна дае 20 марак і 10 за маладога. Доказам служаць лапы забітага ваўка.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошнія дні была (па Цэльсію):

	найвыш.	найніж.
26–27	+ 15,2°	+ 9,0°
27–28	+ 14,1°	+ 6,3°
28 29	+ 15,0°	+ 8,5°
29–30	+ 13,0°	+ 5,8°

З усяго Краю.

Рэйхстаг аб нашым краі.

Глаўная камісія Рэйхстагу ад 26 верасьня. Імперскі камісар для занятых зямель на ўсходзе заявіў паміж інш.: «Супроць нашае школьнае палітыкі у Літве з ніякага боку ня выказана нязгоды».

Шастак.

Шэсьць дзён малаціла,
Шастак зарабіла,—

Сама сябе дзівавала,
Што так многа зарабляла!

А за таго шастака
Ды купіла мужыка,—

Сама сабе задзівіла,
Што так дарага плаціла.

Другі раз пяецца барджэй, і кола круціцца бордзе. Потым узноў пяецца памалу, ды кола тыкеля ходзіць і г. д.

Трасуха.

А ты, руда, хадзі сюды,
А ты, чорна, стаі там!
А я з рудай разьбяруся,
А да чорнай прыцу сам!

Мельнік.

А, мамачка, мельнік
Ды дадушы мельнік.
Вядзець мяне ў ельнік,
Ды да душы ў ельнік.

Гусары.

Гэй, гэй, гусары, вы гўсаркі мае!
Пайшла маці да Кіева,
Дачку дома пакінула.
Пакуль маці зьвярнулася,
Дачка сем раз спаткнулася.

Чыжык.

Чыжык, чыжык, дзе ты быў?
За гарою водку піў:
Выпіў чарку, выпіў дзьве,
Зашумела ў галаве.

*

Чыжык, чыжык, гдзе ты быў?
— За гарою водку піў:
Выпіў чарку — другую,
Узяў жонку крывую.

Бярозка.

Я ў бярэзьніку спала
Я на дуб ножкі клала.
Туды, сюды я дубок калану.
Насыпала жалудоў, чыляну.
А хто тыя жалуды пабярэць,
Той мяне да дому давядзець.

Кадрыля.

Ці я ж табе не казала, на парозе стаўшы:
Ня едзь, ня едзь у дарогу, няхай едзе старшы!
Ці я табе не казала, на прыпечку сеўшы:
Ня едзь, ня едзь у дарогу, няхай едзе меньшы!
Ці я табе не казала, маё любінятка:
Ня едзь, ня едзь у дарогу, няхай едзе матка!
Татка стары, мамка стары, на сьвеце нажыўся,
А ты-ж, маё любінятка, цяпер ажаніўся.

*

А ці я ня дзеўка,
Ці я не паненка:
Рукі — як бічоўкі,
Ногі — як начоўкі!

А ці я ня дзеўка,
Ці я не паненка:
Спадніца ў кружкі,
Чатыры падушкі!

А ці я ня дзеўка,
Ці я не паненка:
Хвартух у ёлкі,
У чатыры полкі!

А ці я ня дзеўка,
Ці я не паненка:
І спаднічка ў радна,
Я з мордачкі ладна!

Полька.

Сьвіньні ў рэпе, сьвіньні ў рэпе,
Парасяты ў грэчцы!
А мужыка без языка
Каля печкі трэцца.

*

Я ня знала горшай мукі,
Як папала шаўцу ў рукі:
Шылам коле, дратвай рэжа,
Разлажыў ды з нажом лезе.

Дэпутат, паляк Сэйда, рэзка выказваецца супроць улучэньня польскае зямлі у Літву. У рэгуляцыі польскага пытаньня заінтэрэсавана уся Эўропа.

Паварот вучыцялёў.

За апошні час вертаецца шмат вучыцеляў, быўшых у расейскіх школах, з Расеі у наш край. Вярнулася ужо больш за 200 вучыцелёў. Гэтымі днямі прыбыў новы транспорт з 60 вучыцелямі

Літоўская бежанская камісія.

Літоўская Тарыба стварыла камісіі пры ўсіх лагерах для бежанцаў, што пры рускай граніцы. Апрача таго знаходзяцца паўнамочныя у карантынах лагерных: Гродня, Беласток, Пінск, Шаўлі, Усены, Падбродзе.

Тэлеграфны тарыф.

Водлуг новага загаду тэлеграфны тарыф у нас і ў Прыбалтыцы такі: слова — 15 фэн., аднак ня менш, як 150 ф. за тэлеграму. Да датковы збор 3 фенігі за слова, але ня менш 15 фэн. за тэлеграму.

БІЦЭРЫ. (Уладыслаўскага пав.) За паўторнае хапаўніцтва пры спаўненьні службовых абавязкаў нямецкі пераводчык Фрайдэнгаммер засуджаны на тры мес. турмы. Асобы, што яму далі хабара засуджаны на 150 марак і 30 дзён турмы.

ГРОДНЯ. На мяшчанскай вул. зладзеі спустошылі кватэру і укралі 30 тысяч марак.

Старык Спіленскі затрымаў на вуліцы 60-летнюю жанчыну з к‹› наўкай малака, перш яе адлупцаваўшы. Яго аддалі пад суд.

БЕЛАСТОК. На Дз кай вуліцы зладзеі у ночы з 14 на 15 верасьня выкралі у адным дому усю электрычную прыладу.

ДРУСКЕНІКІ. Гандляр Шлома Сінес устроіў тутака патайную мылаварню і займаўся забароненым гандлем спіртовымі напіткамі. Яго засудзілі на 30 дзён турмы або 150 марак штрафу.

ЛЕВОНЫ. Млынар Іцка—Бржазінскі займаўся скупляньнем вялікіх запасаў жыта і вывазіў іх з зямель ўпраўленьня. Яго засудзілі на 3 мес. турмы і 500 марак штрафу.

ЛАСОСНА. Фурман Тодэль Гарніцкі завёз у жніўні да млына воз жыта быццам з наручэньня свайго крэйсамту. За нарушэньне прыказу аб рэквізыцыі ураджаю Гарніцкага засудзілі на адзін месяц турмы і 3 тысячы марак штрафу.

ВЕРХПОЛЬЛЕ. Тутака пачалі вельмі часта красьці коні. За апошнія дні ад двух сялянаў ўкралі па адным добрым кані. За зваротак украдзеных каней ўласьціцелі абецуюць па 300 марак.

КАРМЕЛАВА (пад Коўнам) Літоўскі каталіцкі жаноцкі саюз адкрывае у кастрычніку у сваім тутэйшым маёнтку сельска-гаспадарскую школу для дзяўчат. Курс 2-х летні. Ен абымае усе галіны земляробства, садоводства, пшчалаводства і т. д. Прымаюцца дзеці сялян ня ніжэй за 12 гадоў.

УРДОМІН. (Марыямпольскага пав.) Крайсгаўптман рабіў у маі і чырвені месяцы раскопкі гоцкага валу у тутэйшых ваколіцах: знайшлі розныя рэчы медныя і жэлезныя а таксама ганчарныя вырабы. Самае цікавае — гэта бронзавы браслет з дыямэтрам у 18 сантымэтраў.

Судзячы з рэчаў у тутэйшых ваколіцах готы знаходзіліся у І і II сталецьцях пасля Нараджэньня Хрыста. Многа рэчаў дамовай гаспадаркі сьведчаць аб тым, што готы тады ужо вялі аселы спосаб жыцьця.

Украіна.

КІЕУ. Газэты паведамляюць, што сюды прыяжджаюць важныя саноўнікі і члены быўшых расейскіх законадаўчых корпарацыяў.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

Беларуская газэта ў Пецярбурзе.

Нядаўна Беларускі Пецярбурскі Комісарыят пачаў выдаваць вялікую тыднёвую ілюстраваную газэту „Чырвоны Шлях“. № 4 Чырвонага Шляху“ конфіскованы большэвікамі за стацьцю аб нежалежнасьці Беларусі „без цароў і саветаў...“.

МАСКВА. Газэта «Мір» даносіць, што дэкрэт аб агульным тэроры зніштожаны. Ленін у цэнтральным камітэці шчыра прасіў вярнуцца да добрых традыцыяў рэволюцыі. Пасьля гэтага большасьць выказалася проціў тэрору.

МАСКВА. «Извѣстія» публікуюць пісьмо аднаго француза на імя Пуанкарэ, якое раскрывае інтрыгі саюзьнікаў у Расеі. Да гэтага пісьма «Извѣстія» дадаюць паясьненьне, у якім паміж іншым кажацца: „Пасьля раскрыцьця змовы французскіх змоўнікаў Лёкарта, Грэнара і К°, саюзная прэсса абвініла нас у провакацыі. Пасьля таго як мы апублікавалі гэты дакумэнт, яна ня асьмеліцца адказвацца ад істнаваньня подлай авантуры, арганізаванай афіцыяльнымі прадстаўнікамі саюзьнікаў“.

БЭРЛІН. З апошніх вестак савецкае вайска адступіла ў кірунку Шэнкурску і Котласу. Чэха-славакі пасунуліся ў кірунку да Пэрму. Савецкая флётылія на Волзе заняла Частополь на Каме. Савецкае войска заняло Алексадраўскі Гай.

Канфэрэнція ў Уфе, на каторай былі чэха-славакі, абвесьціла незалежнасьць Сібіру. Спаўняльны камітэт ураду складаецца з 5 асоб, якія нясуць адказ перад констытуцыйным сходам. Глаўны пункт праграмы конфэрэнцыі: барацьба з Нямеччынаю і адабраньне забраных ад Расеі зямель.

БЭРН. Тутэйшая агентура ўраду саветаў уведамляе: у Маскве дадзены прыказ арыштаваць англіцкіх і францускіх консульскіх саноўнікаў. Гэтыя асобы ўцяклі да нарвэскага консульства. Ня хочучы абразіць нарвэскую флагу, савецкі ўрад загадаў акружыць салдатамі нарвэскае консульства, каб прымусіць англічан і французаў здацца па добрай волі.

ГЭЛЬСІНГФОРС. Вялікі князь Міхаіл і яго сэкрэтар, як чуваць, арыштаваны ў Пэрмі.

ПАРЫЖ (Гавас). Брытанскі ваенны агэнт на Каўказі забіты 15 верасьня ў Уладыкаўказе.

ШТОКГОЛЬМ. 28.IX. Руская прэсса падае адозву Леніна да быўшых сэнатараў і членаў Гасударственнага Савету працаваць у палітычных і законадаўчых установах.

МАСКВА. У часе набажэнства была скрадзена слаўная ікона Божае Маці, прычым поп, што яе бараніў, сьмяротна ранены. Урад пачаў самае энэргічнае сьледства.

З усяго сьвету.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 29.IX. Глаўная Камісія Рэйхстагу ўчора мела доўгую нараду з канцлерам і статс-сэкрэтаром Гінцэ. Стварыўшаеся ўнутранае палажэньне вымагае хуткае разьвязкі. На першым парадку стаіць пытаньне аб астаўленьні на мэйсцы або выхадзе Рэйхсканцлера, на другім аб хуткім сазваньні Рэйхстагу.

БЭРН (В.Т.В.). 26.IX. На гадовым сходзе шатляндскіх рабочых у Глезго выясьнілася разгалосьсе паміж правадырамі амэрыканскіх і шатляндскіх профэсіянальных саюзай. Філіп Шнаўдэн сказаў: «Хай амэрыканцы ня думаюць, што яны адныя на зямлі!» Рэмсэй Макдональд сказаў: «Амэрыканцы жывуць ня ведаючы нашых справаў: у ваенных справах яны засталіся на цэлае паўсталецьце».

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкія апавяшчэньні.

27.IX. Заходні тэатр.

Ў Шампані паміж вышынямі на заход ад Свіпп, а таксама на паўночны заход ад Вэрдэн паміж Аргонамі і Маас французы і Амэрыканцы пачалі ўчора свае моцные штурмы.

Артылерыйская бітва расшырылася на заход да Пэнс на ўсход да Мозэль Часьцявыя атакі ворага пасьля гарачай бітвы адбіты. На важнейшых часьцёх фронту бітва пяхоты пачалася пасьля вялікага артылерыйскага агню.

На Заход ад Энь французы на ўсход ад Аргон амэрыканцы з вялікім лікам панцырных аўтамабіляў рушылі на нашыя пазыцыі. Пры Таюр і пры Рюпон паўторнымі штурмамі ворагу ўдалося прасунуцца ўперад цераз нашую першую баявую лінію да высаты пры Тагюр і пры Фонтэнь ан Дормуа. Тутака вораг быў затрыманы. Найбольш сільнымі былі яго штурмы пры Обріў і Сомпю. Яны зламаліся перад нашымі лініямі з самымі цяжкімі стратамі. На поўнач ад Сарвя паўторныя штурмы таксама зламаліся.

Між аргонамі і Маас вораг пасунуўся уперад цераз нашую пярэднюю баявую лінію до Монблевіль — Монфукон. Тутака вораг быў затрыманы.

Першы дзень бітвы шырокае насупленьне ворага не ўдалося дзякуючы упорнасьці нашага войска.

28.IX Заходні тэатр.

Англійцы атакуюць на Камбрэ і больш на поўдзень. Францўзы прадаўжаюць свае штурмы ў Шампані, амэрыканцы на ўсход ад Аргон. Гэтыя важнейшыя опэрацыі звязаны з часьцёвымі наступленьнямі паміж Іпром і Скарп, а таксама між Айет і Энь.

Фронт Рупрэхта Баварскага: і генэрал-ан-шэфа ф. Бэн'а: Паміж Іпром і Скарп наступаючы вораг адкінуты. Паміж дарогамі, што вядуць з Арра і Пэррон на Камбрэ англіцкія і канадскія дывізыі пасьля гарачага бою павялі атакі. З абедзьвюх старон Маркіён паміж Мэврэ і Грэнкур а таксама між Рібкур Вільле - Гільлен першы штурм зламаўся перад нашымі лініямі. Пры Эншы вораг прасунуўся на Бурлён, пры Аврэнкур на Флек'ер. У часе бітвы яму ўдалося адсунуць нас на лінію Оассі-лё-Вэржэ-Гэйнкур. Лінію Бурлён-Рібкур мы утрымалі. Перад нашымі пазыцыямі паміж Рібкур і Вільле-Гільлен усе штурмы ворага зламаліся. Паміж Эп'і і Бельлікур моцныя англіцкія і амэрыканскія штурмы адкінуты. Пры Лемпір навет адсунулі ворага ад яго ранейшых пазыцыяў.

Фронт нямецкага Насьледніка і ф. Гальвіца: Паміж Айет і Эн адкінута часьцёвае наступленьне ворага на ўсход ад Воксэён і на заход ад Жуйі.

У Шампані французы прадаўжалі сьвежымі дывізіямі свае штурмы, а к ўсходу ад Аргон амэрыканцы. Французы маглі пасунуцца у сваіх штурмах толькі крыху. Монфокон мы ачысьцілі каб ня быць адрэзанымі. Далейшыя штурмы ворага зламаліся перад нашымі новымі лініямі. Французы і амэрыканцы панясьлі ізноў учора цяжкія страты.

Мы зьбілі ўчора 33 самалёты. Паручык Румэ меў учора сваю 45 перамогу; паручык Лёрцэр 44.

29.IX. Заходні тэатр.

Англійцы разам з бэльгійцамі пашырылі свае штурмы на Фляндрыю і прадаўжалі ў кірунку на Камбрэ. Французы і амэрыканцы атакавалі ізноў у Шампані а таксама паміж Аргонамі і Маас.

Фронт Рупрэхта Баварскага: Ад морскаго берагу на поўдзень да Лісс у ночы гарачая агнявая бітва, каторая на раніцы перайшла ў самы моцны барабанны агонь. Ворагу ўдалося пачасьці ўдзёрціся ў нашыя лініі. Пасьля абеду атака ворагаў затрымана на лініі на поўдзень ад Діксмойдэн-Мэркем-Гутгольст-Вэртрузбэк-Пашэндаль-Бэцэляр-Зантворт-Гольлебэк. На гэтай лініі вечарам адбіты новыя штурмы пры помачы рэзэрваў.

На заход ад Камбрэ мы з прычыны страты пазыцыі з абодвух бакоў ад Маркійён ў бітвах 27 верасьня адцягнулі назад нашы фронт на лінію Арле Обін'і—захад ад Камбрэ і за канал на палудзёны захад ад Камбрэ-Маркойн. Рух зроблены ў ночы бяз ўмешкі ворага. Пасьля абеду вораг атакаваў вялікімі сіламі, але быў адкінуты.

Фронт нямецкага Насьледніка: Між Айет і Энь мы бяз умешкі ворагаў адцягнулі назад нашыя лініі за канал Уаз Энь. Між Свіпп і Энь а таксама паміж Аргонамі і Маас вораг прадаўжаў свае моцныя штурмы. Яны былі страшна крывавыя. Нашае войска атрымала там бліскучую ўдачу ў адбіцьці. Французы, атакаваўшыя на ўсім фронце да 6 разоў сільнымі эскадрамі бронявых аўтомобіляў, адбіты ў заўзятых бітвах. Адна іх удача—гэта заняцьце Сомпю і маленачкіх бухтай нашага абароннага фронту. У Аргонах мы з прычыны руху ворага на даліну Эр адцягнулі назад нашую лінію на Бінарвіль-Апромон. На гэтай лініі амэрыканцы вялі лічныя штурмы з сьвежымі дывізіямі. Вораг адціснуў нашую лінію да лесу Кюнель і Фэ. На ўсім іншым фронце штурмы ворага адбіты з вялікімі стратамі для яго нашым ручным агнём і контратакамі.

Нашыя надпаветраныя экскадры атакавалі з вялікаю удачаю штурмуючыя калённы ворага. Ва ўчарайшых бітвах мы зьнішчылі больш за 150 бронявых аутомобіляў. Мы зьбілі 32 самалёты і 3 балёны на прывязі.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 26.IX. **Урадова.** У Атлянтычным акіяні нашыя падводныя лодкі затапілі 28 тысяч тоннаў, паміж іншымі адзін амэрыканскі параход — цыстэрн.

ВЕНА (В.Т.В.). 28.IX. **Урадова.** На албанскім ваенным тэатры нашыя войскі занялі заместа баўгараў адрэзак Охрыда. Атакі ворагаў тутака адкінуты.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). 27.XI. У блокаднай зоне Сяродземнага мора нашыя падводныя лодкі затапілі 3 параходы і колькі парусьнікаў — разам каля 15.000 тонн (у тым ліку адзін пасажырскі параход на 7.000 тонн).

Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.